УДК 811.161.3

**_Бервячонак А.У._**
_(Мазыр, Беларусь)_

# ЭКЛЕЗІОНІМЫ КУЛЬТАВЫХ БУДЫНКАЎ ЯК ПЕРСПЕКТЫЎНЫЯ АНАМАСТЫЧНЫЯ АБ'ЕКТЫ РАЗВІЦЦЯ РЭЛІГІЙНАГА ТУРЫЗМУ МАЗЫРШЧЫНЫ

_Стаття присвячена дослідженню еклезіонімів культових будов Мозиря і району як важливих об'єктів розвитку релігійного туризму. Аналізуються лексико-семантичні і словотворчі особливості еклезіонімів. Простежується виникнення і історичний розвиток назв культових об'єктів._

**_Ключові слова:_** _еклезіонім, ономастика, релігійний туризм, культовий об'єкт._

_Статья посвящена исследованию экклезионимов культовых строений Мозыря и района как важнейших объектов развития религиозного туризма. Анализируются лексико-семантические и словообразовательные особенности экклезионимов. Прослеживается возникновение и историческое развитие названий культовых объектов._

**_Ключевые слова:_** _экклезионим, ономастика, религиозный туризм, культовый объект._

_The article is devoted to research of names of cult buildings of Mozyr and area as important objects of religious tourism. It analyses the lexical-semantic and word-formation features of eklezionims._

**_Key words:_** _eklezionim, onomastics, religious tourism, cult object._

Горад Мазыр сфарміраваўся ў спецыфічных прыродна-ландшафтных умовах. Яго геаграфічнае размяшчэнне, адасобленае на першых этапах ад еўрапейскіх цывілізацый, стала вынікам адметнасці горада ў станаўленні і развіцці сваёй самабытнай духоўнай і матэрыяльнай палескай культуры, якая захавала свае рысы з глыбокай старажытнасці.

Гэты ўнікальны куток усходняй часткі Беларусі, названы ў народзе _"Беларускай Швейцарыяй"_, валодае значным патэнцыялам для развіцця турызму. Многія аб'екты архітэктуры горада з'яўляюцца важнымі помнікамі гісторыі, якія сведчаць пра мінулыя падзеі і знаёмяць з этапамі станаўлення і развіцця горада (_старажытны замак, бернардзінскі кляштар, манастыры цыстэрцыянак і цыстэрцыянцаў, будынак былой мужчынскай гімназіі і інш._). Усё ж мала будынкаў, якія маюць гістарычную каштоўнасць, уцалела да нашага часу: некаторыя аб'екты рэканструяваны, асобныя захаваліся ў ранейшым выглядзе, астатнія – былі знесены. Менавіта гістарычныя будынкі горада са своеасаблівай духоўнай культурай Палесся лічацца важнымі і перспектыўнымі аб'ектамі для беларускага і замежнага турызму.

Рэлігійны турызм складае састаўную частку сучаснай індустрыі турызму. Помнікі культавай архітэктуры – гэта рэсурсы рэкрэацыйнага турызму. Асноўная мэта рэлігійнага турызму – духоўна-асветніцкая. Т.Т. Хрыстоў падкрэслівае, што "_рэлігійны турызм аказвае вялікае эмацыянальнае ўздзеянне на чалавека, многія людзі пасля паломніцкіх паездак вяртаюцца пераўвасобленымі, вырашыўшымі некаторыя жыццёвыя супярэчнасці, адпачыўшымі і ў добрым стане_" [1: 6]. Культавыя пабудовы Мазыршчыны

© _Бервячонак А.У., 2012_

могуць служыць важнымі аб'ектамі рэлігійнага турызму і паломніцтва, у якіх турысты змогуць убачыць важнейшыя рэлігійныя каштоўнасці горада і раёна: дзеючыя культавыя помнікі (*храм у гонар абраза Замілавання Маці Божай; капліца* і *царкоўны помнік у гонар мітрапаліта Кіеўскага і ўсея Русі Макарыя; касцёл святога Міхаіла Архангела; манастыр бернардзінцаў і інш.*), музей *сабора святога Архангела Міхаіла*, у якім сабраны багаты матэрыял: кнігі, царкоўныя рэчы, абразы і многае іншае, якія датуюцца XVI-XX стст., наведаць набажэнства, прыняць удзел у хросных хадах крыжоў, цудатворных абразоў, напрыклад, з *Тураўскай епархіі ў Свята-Міхайлаўскі кафедральны сабор Мазыра*, пазнаёміцца з матэрыяльна-духоўнай спадчынай храмаў (*спісам (копія абраза) з цудатворнай іконы Божай Маці ў храме ў гонар абраза Замілавання Маці Божай у вёсцы Васькаўка; старажытнай драўлянай статуяй Ісуса Хрыста* ў *касцёле святога Міхаіла Архангела; сямейнай пахавальняй рода Аскерак у Свята-Міхайлаўскім саборы*) і іншых рэлігійных мерапрыемствах.

Сакральныя аб'екты Мазыршчыны з'яўляюцца славутасцю, нацыянальным набыткам, а іх назвы – аблічам культавага будынка, помнікам матэрыяльнай культуры, якія адлюстроўваюць гісторыю, сучаснасць, памяць. "*Вывучаючы матэрыяльна-духоўныя аб'екты культуры*, – адзначае Я.М. Паспелаў, – *неабходна звяртацца да назваў, якія могуць расказаць шмат цікавага аб мінулым і сучасным вывучаемай мясцовасці*" [2: 8]. Назвы культавых аб'ектаў даследуе анамастыка, асновай якіх выступае святасць, сакральнасць. І.У. Бугаёва піша: "*Святасць - адно з фундаментальных паняццяў хрысціянскага вучэння. Паняцці святасці і сакральнасці заўсёды былі важнымі для свядомасці веруючага чалавека. Таму ў працэсе ладу і арганізацыі жыцця, пры анамастычнай намінацыі людзьмі рухаюць усвядомленыя ментальныя, духоўна-маральныя ўяўленні. Даследаванне сакральнага анамастыкона дазваляе атрымаць багатыя і разнастайныя звесткі аб рэлігіі, гісторыі і культуры народа*" [3]. Таму не толькі само ўзвядзенне канфесіянальных будынкаў сакралізуе матэрыяльнае жыццё чалавека, але і самі назвы розных культавых аб'ектаў адлюстроўваюць духоўны свет чалавека, яго адносіны і павагу да рэлігійных здабыткаў, традыцый.

Назвы духоўна-культурных аб'ектаў займаюць важнае месца ў анамастычнай прасторы, сярод якіх асобае месца займаюць *эклезіонімы* – назвы культавых аб'ектаў розных рэлігій, якія ўтрымоўваюць гісторыка-культурную інфармацыю. Гэты пласт лексікі па сутнасці не разглядаўся ў беларускім мовазнаўстве. Розныя аспекты даследавання эклезіонімаў знаходзім у працах расійскіх вучоных: І.У. Бугаёвай, А.П. Арынінай, Б.А. Успенскага, А.А. Мінкіна, В.І. Супруна, М.Е. Каўлена і інш.

І.У. Бугаёва справядліва падкрэслівае, што "*даследуючы назвы сакральных аб'ектаў неабходна звяртацца да гісторыі станаўлення культавых будынкаў, агіяграфіі, эарталогіі і іншых дысцыплін, таму што яны захоўваюць важныя звесткі этапаў ўзнікнення і развіцця рэлігіі, а таксама прычыны з'яўлення назваў рэлігійных аб'ектаў* [4: 20].

З прыняццем і развіццём хрысціянства пачалі ўзнікаць розныя культавыя аб'екты: цэрквы, касцёлы, манастыры, сінагогі і інш., гэта было звязана з пражываннем у горадзе людзей рознага веравызнання: рускіх, украінцаў, літоўцаў, палякаў, яўрэяў, немцаў і інш. Будаўніцтву храмаў надавалася дзяржаўнае і палітычнае значэнне: у іх захоўваліся гарадская казна, бібліятэкі, архівы, праводзіліся сходы гараджан. Пры храмах вучылі грамаце, пісьму.

З XI – XIX стст. у Мазыры дзейнічала 14 рэлігійных будынкаў: *царква святога Спаса*, ці *Праабражэння Гасподняга* (XI ст.), *жаночы Параскевінскі манастыр* (XI ст.), *царква святога Мікалая Цудатворца* (XVI ст.), *базыліянскі манастыр* (XVI ст.), *Багародзіцкая царква* (XVI ст.), *рымска-каталіцкі касцёл у імя Ушэсця Дзевы Марыі* (XVII ст.), *царква святога Пятра* (XVIII ст.), *касцёл святога Міхаіла Архангела* (XVIII ст.), *жаночы манастыр цыстэрцыянак* (XVIII ст.), *мужчынскі манастыр цыстэрцыянцаў* (XVIII ст.), *кляштар бернардзінцаў* (XVIII ст.), *царква святога Міхаіла Архангела* (XVIII ст), *царква ў гонар святой Вялікапакутніцы Параскевы Пятніцы* (XVIII ст.), *Свята-Троіцкая царква* (XIX ст.). Назвы гэтых культавых аб’ектаў звязаны са святасцю, якія адлюстроўваюць разнастайныя звесткі аб рэлігіі, гісторыі і культуры народа. Разам з праваслаўнымі і каталіцкімі храмамі будаваліся і *сінагогі*, у канцы XIX пачатку XX стст. існавалі *тры будынкі сінагог,* якія знаходзіліся насупраць сучаснай лазні, на плошчы Горкага, дзе маліліся гаспадары-рамеснікі, хасіды і літвакі, назвы гэтых будынкаў страціліся [5: 51-112].

У гады савецкай улады (XX ст.) рэлігія падвяргалася ганенням, большасць храмаў і манастыроў закрылі, некаторыя – разбурылі. Новыя культавыя будынкі не ўзводзіліся, таму што ўлада імкнулася паменшыць ролю царквы ў жыцці грамадства і аддзяліць яе ад дзяржавы.

З сярэдзіны 90-х гадоў XX ст. на Мазыршчыне назіраецца перыяд адраджэння рэлігіі: у жніўні 1997 г. была адкрыта міжнародная хрысціянская *Новаапостальская царква;* у 1998 г. каля Кургана Славы у памяць абаронцаў айчыны была пабудавана *царква святога велікамучаніка Георгія Пабеданосца*; 24 красавіка 2004 г. у мікрараёне «Зарэчны» была ўзведзена *царква Увядзенне ў храм Найсвяцейшай Багародзіцы;* у 2007 годзе было завершана будаўніцтва *храма абраза Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць»;* у 2009 г. пабудавалі *храм у гонар вялебнага Сергія Раданежскага*, 18 ліпеня 2009 г. прыходу перададзены абраз Сергія Раданежскага з часціцай святых мошчаў; у 2010 г. на гары Камунараў была аднаўлена *Спаская царква* [6].

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў вёсках Мазырскага раёна знаходзілася каля 12 культавых будынкаў, цэрквы размяшчаліся амаль у кожным буйным населеным пункце, пасля рэвалюцыі дзейнічала каля 4 рэлігійных аб’ектаў, астатнія – былі знішчаны ўладай. У цяперашні час на Мазыршчыне таксама працуюць храмы: у вёсцы Васькаўка аднаўлены *храм у гонар абраза Замілавання Маці Божай* (1993г.), царква гэта была пабудавана на месцы, дзе быў знойдзены цудатворны абраз, які потым быў страчаны; у вёсцы Скрыгалаве захаваліся *капліца* і *царкоўны помнік у гонар мітрапаліта Кіеўскага і ўсея Русі Макарыя*, на гэтым месцы ён быў забіты татарамі (XVI ст.); у вёсцы Махнавічы працуе *прыход храма Увядзенне ў храм Найсвяцейшай Багародзіцы* (2007 г.); у вёсцы Міхалкаўская Рудня працуе *царква святога Архангела Міхаіла* (2002г.); у вёсцы Слабада ў 2009 г. аднавілі *храм святога Архангела Міхаіла*; у вёсцы Асавец у 1997 г. быў зарэгістраваны *храм у гонар мітрапаліта Кіеўскага і ўсея Русі Макарыя*; у пасёлку Крынічны ў 2005 г. адкрылі *храм Сабора Беларускіх святых* [6]. Манастыры, храмы – цэнтры рэлігійнага жыцця насельніцтва, а іх назвы – частка мясцовай гісторыі. “*Рэлігія ўплывае на фарміраванне самасвядомасці і стэрэатыпаў паводзін людзей*, – піша Т.Т. Хрыстоў, *– яна выступае элементам грамадскай сістэмы і ў многіх выпадках – адным з найважнейшых*” [1: 6].

Назвы культавых аб’ектаў, як і самі будынкі, з’яўляюцца часткай матэрыяльнай культуры народа. Эклезіонімы ўтрымліваюць пазнавальную інфармацыю, яны адлюстроўваюць лікі і дзеянні святых асоб. Напрыклад, у назвах храмаў часта згадваецца імя «Міхаіл» – гэта архангел, які абараняе «законы Божыя», змагаючыся са злымі духамі. Веруючыя лічаць, што ён спрыяе вылячэнню хвароб, якія, як мяркуюць, выклікаюцца злымі духамі. Таму нярэдка храмам даецца імя гэтага святога. Назва «*Новаапостальская*» азначае адраджэнне царквы, якая была першапачаткова ўстаноўлена дванаццаццю апосталамі Хрыста. Назвы сакральных аб’ектаў захоўваюць памяць і звесткі пра святых асоб і маюць асветніцка-пазнавальны характар, што з’яўляецца важным элементам рэлігійнага турызму [7].

Многія культавыя будынкі Мазыра ў гістарычны час былі знішчаны (каля 17), некаторыя адноўлены, астатнія, якія захаваліся, маюць рознае прызначэнне (6). Сярод гісторыка-архітэктурных культавых помнікаў горада захаваліся: *касцёл бернардзінцаў* – цяперашні *Свята-Міхайлаўскі сабор* (1645 г.), *кляштар бернардзінцаў,* ёсць меркаванне, што ад кляштара ішоў падземны ход да Кімбараўскага кляштара, а адтуль – ход у Юравіцкі манастыр (1760-1778 гг.), *манастыр цыстэрцыянак* – цяперашняя вяслярная база (1610 г.), *касцёл святога Міхаіла Архангела* (1743 г.), *мужчынскі манастыр цыстэрцыянцаў* – цяперашняя мэблевая фабрыка (першая палова XVIII ст.), адноўленая *царква святога Мікалая Цудатворца* (першая палова XX ст.). Фасады асобных рэлігійных будынкаў засталіся не адрэстаўрыраванымі, хоць гэтыя пабудовы і аднесены да катэгорыі гісторыка-архітэктурных каштоўнасцей дзяржавы (*кляштары цыстэрцыянак і цыстэрцыянцаў, бернардзінцаў*).

На працягу шматлікіх стагоддзяў рэлігія спрыяла станаўленню дзяржаўнасці, аказвала і працягвае аказваць моцны ўплыў на грамадства, на арганізацыю побыту, маральнасць, культуру, навуку, эканоміку. Рэлігійная дзейнасць і адносіны да яе садзейнічалі і садзейнічаюць стварэнню і назапашванню каштоўнасцей у матэрыяльнай і духоўнай сферы.

Рэлігійныя будынкі і іх назвы ўтрымліваюць культурна-пазнаваўчую інфармацыю, знаёмяць з гісторыяй святых месцаў, жыццём святых, архітэктурай, царкоўным мастацтвам. Як адзначае В.А. Жучкевіч, што “*нельга вывучаць назвы без вывучэння асаблівасцей аб’екта, таму што аб’ект часта атрымлівае назву па характэрных рысах*” [8: 32]. У назвах адлюстроўваюцца геаграфічныя асаблівасці мясцовасці, гісторыя, эканоміка, палітыка, мова, культура, цывілізацыя і інш. Эклезіонімы з’яўляюцца часткай анамастычнай прасторы, якія адносяцца толькі да аб’ектаў культавага прызначэння. Большасць эклезіонімаў утвораны: ад *тэонімаў* – імён багоў (святой троіцы, анёлаў, архангелаў і інш.), *агіяантрапонімаў* – кананізаваных імён святых; *іконімаў* – уласных імён, якія абазначаюць найменні абразоў; *эартонімаў* – уласных імён, якія абазначаюць назвы царкоўных свят [9: 84]. Назвы храмаў абазначаюць, у гонар якога святога, свята ці абраза асвячоны пасад.

Эклезіонімы цесна звязаны з пэўнымі апелятывамі, якія з’яўляюцца пастаяннымі матывіруючымі кампанентамі ў складзе ўсёй структурнай тэрмінаадзінкі пэўнага культавага аб’екта. У якасці апелятываў выступаюць: *касцёл* – каталіцкі храм [10: 659]; *царква* – будынак, у якім адбываецца праваслаўнае набажэнства [11: 228]; *сабор* – галоўная або вялікая царква ў горадзе [11: 10]; *сінагога* – памяшканне, якое служыць для

яўрэйскага богаслужэння [11: 135], *кляштар* – каталіцкі манастыр [11: 704]; *манастыр* – жылое памяшканне, якое належыць манахам [12: 101]; *капліца* – невялікі царкоўны або касцёльны будынак з абразамі без алтара, малельня [10: 631]; *храм* – збудаванне, прызначанае для рэлігійных абрадаў [11: 11]. Пры ўтварэнні ўсёй намінацыі культавага аб’екта апелятывы займаюць пераважна прэпазіцыйнае становішча, кваліфікуючы тым самым від канкрэтнага аб’екта. Апелятыўная лексіка, якая ўваходзіць у склад эклезіонімаў, указвае на індывідуальныя асаблівасці аб’екта, на прыналежнасць яго да пэўнай рэлігіі.

У намінатыўны склад эклезіонімаў Мазыршчыны ўваходзяць розныя сакральныя ўласныя імёны, якія з’яўляюцца важнымі для рэлігіі:

а) імёны біблейскіх святых (*Дзева Марыя, Святы Спас* (у 4 назвах));

б) апосталаў (*Пётр, Новаапостальская* (у 2 назвах));

в) анёлаў (*архангел Міхаіл* (у 4 назвах));

г) манахаў, святароў, кананізаваных асоб (*Сергій Раданежскі, Мікалай Цудатворац, Параскева Пятніца, мітрапаліт Макарый* (у 8 назвах));

д) назвы абразоў (*абраз Замілавання Маці Божай, абраз Божай Маці “Усіх тужлівых Радасць”* (у 2 назвах));

е) свят (*у гонар свята Увядзенне ў храм Найсвяцейшай Багародзіцы* (у 2 назвах)).

Змест усёй тэрмінаадзінкі фарміруецца вакол аднаго якога-небудзь імені як сэнсаўтваральнай дамінанты: *царква святога <u>Спаса</u>, царква святога <u>Пятра</u>, храм Увядзення ў храм Найсвяцейшай <u>Багародзіцы</u> і інш.*

У стылістычных адносінах адны намінацыі функцыянуюць у афіцыйным канфесіянальным стылі, іншыя – маюць гутарковы змест. У народнай мове замест складанага тапоніма можа ўжывацца адно слова: царква святога Міхаіла Архангела – *Міхайлаўская*, царква ў гонар святой Вялікапакутніцы Параскевы Пятніцы – *Параскевінская, Пятніцкая і інш* [13: 216]. Народныя, гутарковыя назвы больш лаканічныя ў параўнанні з афіцыйнымі, што дае людзям лягчэй запамінаць і зручна карыстацца ў паўсядзённым жыцці *(Пятроўская царква, Мікалаеўская, Багародзіцкая царква)*.

Для ўказання месцазнаходжання культавага аб’екта выкарыстоўваюцца адпаведныя словы-арыенціры тыпу: *на гары Камунараў, на плошчы Горкага, у Навіках і інш*. Адрасная інфармацыя дапамагае жыхарам, турыстам у арыентацыі, выяўленні знаходжання пэўнага касцёла, царквы, манастыра і інш.

У складзе назвы некаторыя адзінкі могуць уступаць у гіпанімічныя рода-відавыя ўзаемадзеянні: *культавыя аб’екты* – род, *цэрквы, касцёлы, капліцы і інш.*– від; *святыя* – род, *імёны святых* – від [13: 217]. Эклезіонімы могуць утвараць сінанімічна-стылістычныя рады. У якасці дамінанты выступаюць імёны святых: *царква святога Архістраціга Божага Міхаіла - царква святога Архангела Міхаіла - Свята-Міхайлаўскі сабор - Міхайлаўская царква,* дамінанта – *святы Міхаіл*.

Паводле колькаснага складу эклезіонімы бываюць адна-двух-трохкампанентныя і шматкампанентныя: *Багародзіцкая царква, царква святога Спаса, касцёл святога Міхаіла Архангела, касцёл ў імя Ушэсця Дзевы Марыі*. Выражаюцца гэтыя найменні назоўнікам у Р.скл; прыметнікам з назоўнікам (*касцёл ў імя Ушэсця Дзевы Марыі, Свята-Троіцкая царква, Параскевінскі манастыр і інш.)*. Эклезіонімы ўтвараюцца

кампазіцыйным і суфіксальным спосабам: *манастыр святой Параскевы Пятніцы – Параскевінскі манастыр, Свята-Міхайлаўскі сабор, царква Святой Троіцы – Свята-Троіцкая царква*.

Некаторыя онімы-назвы ўжываюцца са словамі *ў імя*, *у гонар* (храм *у гонар* іконы Замілавання Маці Божай, касцёл *ў імя* Ушэсця Дзевы Марыі). Асобныя эклезіонімы могуць ускладняцца дыферэнцыятарам, у якасці якога могуць выступаць дэскрыптары (Мікалай *Цудатворац*), агномены (вялікамучанік Георгій *Пабеданосец*), лакалізатары (мітрапаліт *Кіеўскі і ўсея Русі* Макарый), кагномены (Сяргей *Раданежскі*), этнонімы (храм Сабора *Беларускіх* Святых) і інш. Гэтыя адзінкі выконваюць дадатковую інфармацыйную функцыю.

З пункту гледжання словаўтваральных асаблівасцей эклезіонімы ўтвараюць розныя мадэлі, апелятывы могуць размяшчацца ў прэ- і постпазіцыі і ўскладняцца дыферэнцыятарам (*у імя, у гонар*):

а) апелятыў + тэонім: *царква + святога Спаса; Багародзіцкая + царква; касцёл + ў імя + Ушэсця Дзевы Марыі; царква + святога Пятра; касцёл + святога Міхаіла Архангела; Свята-Троіцкая + царква; Новаапостольская + царква; царква + святога Архангела Міхаіла;*

б) апелятыў + агіяантрапонім: *жаночы+ Параскевінскі + манастыр; царква + святога Мікалая Цудатворца; царква + ў гонар + святой Вялікапакутніцы Параскевы Пятніцы; царква + святога вялікамучаніка Георгія Пабеданосца; храм + у гонар + вялебнага Сергія Раданежскага; капліца + у гонар + мітрапаліта Кіеўскага і ўсея Русі Макарыя; храм + Сабора Беларускіх святых;*

в) апелятыў + эартонім: *храм + Увядзення ў храм Найсвяцейшай Багародзіцы;*

г) апелятыў + іконім: *храм + абраза Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць»; храм + у гонар + абраза Замілавання Маці Божай*.

Адзін і той жа эклезіонім можа мець дваякае ўжыванне: апелятыў + уласнае імя (наз. у Р.скл.), уласнае імя (у форме адноснага прыметніка) + апелятыў (*царква + святога Пятра, Багародзіцкая + царква*) [13: 219-220].

Неабходна адзначыць, што на Мазыршчыне ёсць культавыя будынкі, якія маюць аднолькавыя эклезіонімы: *Увядзенне ў храм Найсвяцейшай Багародзіцы* - 2 назвы, *мітрапаліт Кіеўскай і ўсея Русі Макарый* - 2 назвы; *святы Міхаіл Архангел* - 3 назвы.

У тапанімічных назвах культавых будынкаў можа адбывацца трансфармацыя ядра імені асноўнай мадэлі ў вытворную і пераход імені ва ўласны інфармацыйны прыметнік: *Спас* (ядро) →*святы Спас* →*царква святога Спаса* →*Спаская царква; Мікалай* (ядро) → *святы Мікалай* → *царква святога Мікалая* → *Мікалаеўская царква* [9: 84].

Як вядома, усе культавыя аб’екты маюць адпаведныя назвы. Імя і аб’ект у гэтых адносінах утвараюць гармонію, адзінае дыялектычнае цэлае. Таму надзвычай важна для існавання сакральных аб’ектаў правільны выбар адпаведнага імя, якое павінна выражаць сутнасць і прызначэнне дадзенай рэаліі, мець псіхалагічна-уплывовы *сэнс святасці*. У спіс такіх эклезіонімаў уключаюцца найменні ад самых высокіх біблейскіх асоб да самых звычайных, зямных.

Рэлігійныя аб’екты павінны служыць своеасаблівай рэкламай беларускім і замежным турыстам, для гэтага неабходна прыцягваць добраахвотныя зборы, сродкі інвестараў, якія можна выкарыстоўваць для рэканструкцыі, рэстаўрацыі старых і ўзвядзення новых

пабудоў, што дасць магчымасць пашырэнню, удасканаленню, развіццю турызму і неабходнага прыбытку дзяржаве і прыватным прадпрымальнікам.

Такім чынам, у гістарычны перыяд зафіксаваных культавых будынкаў на Мазыршчыне налічвалася: 18 у горадзе і 16 у раёне; у цяперашні час налічваецца 8 храмаў у горадзе і 8 у розных вёсках раёна, раней колькасць рэлігійных будынкаў была значна большая (34 аб'екты), чым цяпер (16), таму што царква выступала галоўным кіруючым органам горада і раёна, зараз яна выконвае толькі духоўную і асветніцкую функцыю. У сучасны перыяд ў Мазыры і раёне адноўлена 5 храмаў (15%) і 11 пабудавана новых (33%).

Сярод мноства помнікаў мінулых часоў важнае месца займаюць і сакральныя збудаванні: *цэрквы, капліцы, манастыры, сінагогі* і інш., назвы якіх складаюць самастойны лексічны пласт эклезіонімаў у беларускай і ў цэлым агульнаславянскай тапаніміцы. Намі разгледжана 26 эклезіонімаў. Шматкампанентныя эклезіонімы складаюць большую колькасць (20 назваў-87%), чым аднакампанентныя (3 назвы-12%), яны выражаюцца прыметнікам ці назоўнікам у родным склоне. Эклезіонімы, утвораныя ад агіяантрапонімаў складаюць большую колькасць – 8 назваў, 10 эклезіонімаў утвораны ад тэонімаў, 2 – ад іконімаў і 2 – ад эартонімаў.

Культавыя аб'екты характарызуюцца адметным унутраным убранствам, знешняй архітэктурнай пабудовай, якія разам з акаляючым асяроддзем ствараюць адзіны ансамбль святасці з непарыўнай духоўнай энергетыкай божай міласці, якая ўздзейнічае на псіхіку чалавека. Сакральныя будынкі, іх назвы, мясцовасць, дзе яны знаходзяцца, з'яўляюцца значымымі, унікальнымі і перспектыўнымі аб'ектамі развіцця і ўдасканалення рэлігійнага турызму Мазыра з высокім пазнавальным і эстэтычным патэнцыялам.

## ЛІТАРАТУРА


1. Христов Т.Т. Религиозный туризм: учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений / Тодор Тодорович Христов. – 2-е изд., испр. – М. : Издательский центр «Академия», 2005. – 288 с.

2. Поспелов Е.М. Туристу о географических названиях / Евгений Михайлович Поспелов. – М. : Профиздат, 1988. – 192 с.

3. Бугаева И.В. Обозначения святости в ономастическом пространстве русского языка [Электронный ресурс] / Ирина Владимировна Бугаева: Православный образовательный портал "Слово". – Филология. – режим доступа: http://www.portal-slovo.ru/philology.

4. Бугаева И.В. Русская словесность и православная духовность: методические аспекты межкультурного взаимодействия/ Ирина Владимировна Бугаева. – Курск : Русский язык и культура: проблемы преподавания в вузах Российской Федерации: материалы науч.-практ. семинара, 2008. – С. 18-52

5. Бобр А.Г. Мой Мозырь: ист. очерк. – Ч.1 / Александр Григорьевич. – Минск: ФОРТ, 1996. – 162 с.

6. Туровская епархия: храмы и монастыри [Электронный ресурс]. – режим доступа: http://www.turov.by.

7. Названия церквей [Электронный ресурс]. – режим доступа: http://www.mycicerone.ru/wiki.

8. Жучкевич В.А. Топонимика / Вадим Андреевич Жучкевич. – Минск: Высш. шк., 1964.– 324 с.

9. Бугаева И.В. К вопросу о структуре сакрального ономастикона / Ирина Владимировна Бугаева. – М. : Вестник МГУЛ. – 2006. – № 100. – С.83-87.

10. Тлумачальны слоўнік беларскай мовы: [у 5 т.] . – Т.2 / пад агул. рэд. К. Атраховіча. – Мінск : Гал. рэд. Бел СЭ, 1978. – 768с.

11. Тлумачальны слоўнік беларскай мовы: [у 5 т.] . – Т.5.К1 / пад агул. рэд. К. Атраховіча. – Мінск : Гал. рэд. Бел СЭ, 1982– 663с.

12. Тлумачальны слоўнік беларскай мовы: [у 5 т.]. – Т.3 / пад агул. рэд. К. Атраховіча. – Мінск : Гал. рэд. Бел СЭ, 1979. – 672с.

13. Аринина Е.П Экклезионимы как разновидность наименований в русской ономастической системе / Елена Павловна Аринина. – Самара. :Вестник СамГУ, 2007. –№5. – С.215-220.

УДК 81’373/821.161.1 – Уст

***Мукоид О.В.***
*(Киев, Украина)*

## ЖАРГОНИЗМЫ В РЕЧИ ПЕРСОНАЖЕЙ В ПОВЕСТИ ТАТЬЯНЫ УСТИНОВОЙ «НЕРАЗРЕЗАННЫЕ СТРАНИЦЫ»

*Статтю присвячено дослідженню жаргонізмів у мові персонажів повісті Т. Устінової «Неразрезанные страницы». Проводиться аналіз цілей вживання такої лексики, її належності до певних частин мови, лексико-семантичних груп, належності до різноманітних сфер життя.*

***Ключові слова:*** *жаргон, жаргонізм, уголовный жаргон, nomina agentis, артефакт, іменник, дієслово.*

*Статья посвящена исследованию жаргонизмов в речи персонажей повести Т. Устиновой «Неразрезанные страницы». Проводится анализ целей употребления данной лексики, её частеречной, лексико-семантической принадлежности к различным сферам жизни.*

***Ключевые слова:*** *жаргон, жаргонизм, уголовный жаргон, nomina agentis, артефакт, существительное, глагол.*

*The article deals with exploring jargons in the speech of the the characters in the work “Неразрезанные страницы” by T. Ustinova. The analysis of the aims of using such lexics and belonging it to the parts of speech, lexical and semantic groups, different spheres of life is made.*

***Key words:*** *jargon, jargons, criminal jargon, nomina agentis, artifact, noun, verb.*

© *Мукоид О.В., 2012*